Ambasada Kultury

**PerspAKTIV абвяшчае адкрыты прыём заявак для беларускіх дзеячаў культуры і мастацтва на ўдзел у рэзідэнцыі ў Германіі і Польшчы восень-зіма 2022 года**
**Дэдлайн падачы заявак 30 чэрвеня**

Праект PerspAKTIV ставіць сваёй мэтай падтрымку дзеячаў культуры з Беларусі, стварэнне бяспечных умоў для іх прафесійнай рэалізацыі, абмена вопытам і ўзнікнення новых сувязяў паміж работнікамі і работніцамі культуры з Беларусі і міжнародным мастацкім камьюніці. PerspAKTIV ініцыяваны Belarusische Gemeinschaft RAZAM у партнёрстве з Ambasada Kultury і IN SITU і ажыццяўляецца пры падтрымцы Міністэрства Замежных Спраў Нямеччыны.

Праект запрашае да ўдзелу беларускіх дзеячаў культуры і мастацтва, якія працуюць у галіне сучаснага мастацтва, музыкі, тэатра і перфарматыўных практык незалежна ад іх узросту і месца цяперашняга знаходжання.

Перавага ва ўдзеле ў рэзідэнцкай праграме будзе аддаваца тым, хто:

- працуе ў актуальных напрамках сучаснага мастацтва, тэатра ці музыкі
- не мае магчымасці для прафесійнага развіцця і працы ў дадзены момант у Беларусі
- не мае магчымасці адкрытай творчай рэалізацыі
- падвяргаўся фактам цэнзуры з боку ўлады і інстытуцый культуры
- стаў ахвярай палітычных рэпрэсій

Валоданне ангельскай/нямецкай ці польскай мовай пажадана

Ужо зараз у сетку партнёраў уваходзяць Sasha Waltz & Guests (DE), Fundacja IN SITU/ Sokołowsko Laboratoriu Kultury (PL), PIK Art galeria (PL) і мы плённа працуем над яе пашырэннем. Калі ў вас ёсць праграма рэзідэнцый ці культурніцкая арганізацыя, з якой вы хацелі б працаваць, калі ласка пазначце яе ў апытальніку.

Праграма рэзідэнцый, цягам ад аднаго да трох месяцаў, у 2022 годзе адбудзецца з верасня па снежань і пакрывае выдаткі на падарожжа, пражыванне і стыпендыю.

Дэдлайн падачы заявак - 30 чэрвеня

**спасылка на апытальнік:** https://forms.gle/EQEsiHFqHoWkwXao7

Праект PerspAKTIV рэалізуюць RAZAM, Ambasada Kultury і IN SITU пры фінансавай падтрымцы Федэральнага міністэрства замежных спраў Германіі.

*#CivilSocietyCooperation*